**Юрка, К.** Адкрыты помнік «афганцам» / К. Юрка // Аршанская газета. — 1994. — 12 сак. — С. 1.

## АДКРЫТЫ ПОМНІК «АФГАНЦАМ»

У нядзелю, 6 сакавіка, адбылося адкрыццё помніка ахвярам афганскай авантуры былога СССР. На адкрыцці мемарыяла прысутнічалі: начальнік штаба мінабароны, першы намеснік міністра абароны Беларусі генерал-лейтэнант М. П. Чуркін, старшыня Саюза кампазітараў Беларусі І. М. Лучанок, старшыні гарадскога і раённага Саветаў народных дэпутатаў У. Г. Навацкі і Ф. В. Мішульскі, іншыя афіцыйныя асобы. На адкрыццё помніка таксама прыехалі прадстаўнікі аб’яднанняў воінаў-«афганцаў» з Гомеля, Гародні, Барысава, Жодзіна, Масквы, Бранска, Курска, Ніжняга Ноўгарада, Калінінграда і Пскова.

Адкрываюсы мітынг старшыня горсавета У. Г. Навацкі выказаў удзячнасць аўтарам праекта помніка, а таксама Віткамбанку, Прамбудбанку, МП «Арыён» ды іншым арганізацыям і асобам, што аказалі дапамогу пры ўзвядзенні помніка. Права адкрыць помнік было прадстаўлена старшыні гарадской асацыяцыі воінаў-«афганцаў» М. А. Ларыёнаву і дзвум маці загінуўшых – Н. Сямёнавай і Н. Паньковай. Прагучаў трохкратны залп.

Вядучая мітынгу В. М. Сіднякова зачытала імёны аршанцаў, што склалі свае галовы ў далёкай краіне. Да помніка, асвечанага праваслаўным светаром, былі ўскладзены вянкі ад старшыні Савета Міністраў Беларусі В. Ф. Кебіча, ад Віцебскага аблсавета народных дэпутатаў, ад Міністэрства абароны Беларусі, ад рэспубліканскага савета ветэранаў Афганістана, ад Аршанскіх гарадскога і раённага Саветаў народных дэпутатаў, ад аршанскай гарадской асацыяцыі воінаў-«афганцаў», ад сваякоў загінуўшых, ад ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны.

На мітынгу выступілі: старшыня Віцебскагааблсавета народных дэпутатаў У. П. Кулакоў, старшыня гарадской асацыяцыі воінаў-«афганцаў» М. А. Ларыёнаў, маці загінуўшага Н. М. Набеева, урадавы сакратар Рэспублік Беларусь Г. І. Данілаў, член гарсавета ветэраскай арганізацыі Ф. Р. Гераскевіч, старшыня Віцебскай абласной асацыяцыі воінаў-«афганцаў» С. М. Гаварушкін і інш.

Пасля мітынгу прысутныя накіраваліся ў Палац культуры льнокамбіната, дзе іх чакаў канцэрт эстрадных артыстаў Я. Паплаўскай і А. Ціхановіча

**К. Юрка**